ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

ОРГАН КОСАЎСКАГА РК КП(б) БЕЛАРУСІ І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 16 (36) Нядзеля 22 красавіка 1945 г.

## НОВЫМІ ПОСПЕХАМІ СУСТРЭНЕМ 1 МАЯ

Працоўныя нашага раёна, як і ўвесь беларускі народ, рыхтуюцца сустрэць 1 мая новымі працоўнымі подзвігамі.

Ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі раёна ідзе напружаная работа Работнікі мясцовай прамысловасці, уключыўшыся ва ўсебеларускае соцыялістычнае спаборніцтва, значна павялічылі выпуск прадукцыі шырокага спажывання. Аднаўляецца сетка навучальных, лячэбных і культурна-асветных устаноў.

Дружная праца ідзе на палях раёна. Кожны селянін, кожная сялянка стараюцца сустрэць вялікае ўсенароднае свята датэрміновым выкананнем плана веснавой сяўбы. Многія вёскі і асобныя сялянскія гаспадаркі ўжо закончылі сяўбу ранніх яравых культур, распачалі сяўбу бульбы, рыхтуюць глебу пад тэхнічныя культуры. Засеяць больш, засеяць лепш, атрымаць высокі ўраджай — вось дэвіз кожнага працаўніка сельскай гаспадаркі.

Жадаючы не астравіць не засеяным ні аднаго гектара яравога кліна, сяляне ва ўсіх вёсках арганізавалі шырокую ўзаемадапамогу бясконным гаспадаркам, дапамагаюць насенпем сем'ям, моцна пацярпеўшым ад нямецкіх акупантаў.

Сяляне і сялянкі, рабочыя і служачыя! Шырэй разгорнем прадмайскае соцыялістычнае спаборніцтва. Новымі працоўнымі подзвігамі сустрэнем вялікае свята працоўных усяго свету — 1 мая!

## ДАКЛАД ДЛЯ ПРАЦОЎНЫХ ГОРАДА

Учора ў памяшканні гарадскога клуба для працоўных горада быў зроблен даклад на тэму: „Аб ваенна палітычным і міжнародным становішчы СССР".

Даклад зрабіла лектар ЦК ВКП(б) т. Джыганенка.

Даклад прайшоў з вялікім поспехам. На ім прысутнічала звыш 150 чалавек.

## ДОШКА ПАЧОТА

Пастановай РК КП(б) Беларусі і Выканкома райсовета дэпутатаў працоўных ад 21 красавіка г. г. на раённую Дошку Пачота заносяцца наступныя сяляне і ўпаўнаважаныя сельскіх советаў, выканаўшыя план сяўбы ранніх зернавых культур і аказаўшыя дапамогу бясконным гаспадаркам:

1. ТУШЧЫК НІКАЛАЙ КАНСТАНЦІНАВІЧ, упаўнаважаны Выканкома Альшаніцкага сельсовета ў в. Скураты, які на 21 красавіка г. г. выканаў план сяўбы ранніх зернавых культур і арганізаваў дапамогу ў сяўбе 80 бясконным гаспадаркам.

2. ЩУМОВІЧ ВАСІЛЬ МІХАЙЛАВІЧ, упаўнаважаны Выканкома Альшаніцкага сельсовета ў вёсцы Хрышчоновічы, які выканаў план сяўбы ранніх зернавых культур і арганізаваў дапамогу ў сяўбе 34-м бясконным гаспадаркам.

3. БРЫЛЬ МАКАР ВАСІЛЬЕВІЧ, селянін в. Любішчыцы, які выканаў план сяўбы ранніх зернавых культур і аказаў дапамогу ў сяўбе 2-м бясконным гаспадаркам.

4. МАТУСЕВІЧ СОНЯ ФЁДАРАЎНА, сялянка в. Аўсто Стайкаўскага сельсовета, якая выканала план сяўбы ранніх зернавых культур і аказала дапамогу ў сяўбе 4-м бясконным гаспадаркам.

5. КРУК ВІКЕНЦІЙ ВАРФАЛАМЕЕВІЧ, селянін в. Гошчава, які выканаў план сяўбы ранніх зернавых культур і аказаў дапамогу ў сяўбе 2-м бясконным гаспадаркам.

## У Выканкоме райсовета дэпутатаў працоўных і РК КП(б) Беларусі

Выканком райсовета дэпутатаў працоўных і райком КП(б) Беларусі разгледзелі ход соцыялістычнага спаборніцтва паміж сельскімі советамі ў праводзенні веснавой сяўбы па становішчу на 21 красавіка г. г.

Пераходны Чырвоны Сцяг, які ў мінулую пяцідзёнку быў уручан Любішчыцкаму сельсовету, прысуджан Яблонскаму сельсовету (старшыня сельвыканкома т. Барсук), які ў соцыялістычным спаборніцтве выйшаў на першае месца ў раёне, выканаўшы план сяўбы зернавых культур на 98,8 процанты.

Райвыканком і райком КП(б)Б адзначылі што другое месца ў соцыялістычным спаборніцтве заняў Любішчыцкі сельсовет (старшыня Выканкома тав. Касавец), выканаўшы план сяўбы зернавых культур на 92,9 процанты, трэцяе — Стайкаўскі сельсовет (старшыня выканкома т. Кулецкі), які выканаў план сяўбы зернавых на 91,4 проц.

Выканком райсовета дэпутатаў працоўных і РК КП(б)Б адзначылі нездавальняючае кіраўніцтва веснавой сяўбой з боку Выканкома Яглевіцкага сельсовета (старшыня Выканкома т. Левашэня) які выканаў план сяўбы зернавых на 35,2 проц., Выканкома Белавіцкага сельсовета (старшыня выканкома т. Дземідовіч), які выканаў план сяўбы зернавых культур на 57,1 проц., і Выканаўчага камітэта Бусяжскага сельсовета (старшыня Выканкома т. Веклічаў), выканаўшага план сяўбы зернавых культур на 43,8 процанты.

# СЯЛЯНЕ І СЯЛЯНКІ ВЁСКІ РАЗМЕРКІ ЗМАГАЮЦЦА ЗА ДАТЭРМІНОВАЕ ВЫКАНАННЕ ПЛАНА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

## Не аставім не пасеяным ні аднаго гектара зямлі

На працягу ўсяго перыяда з дня вызвалення раёна сяляне вёскі Размеркі добрасумленна выконваюць усе задачы, якія ставяць перад імі большэвіцкая партыя і совецкі ўрад.

У падзяку Чырвонай Арміі за сваё вызваленне сяляне датэрмінова выканалі хлебапастаўкі ў 1944 годзе, многа хлеба, бульбы і мяса здалі ў фонд Чырвонай Арміі. У зімні перыяд яны актыўна працавалі на нарыхтоўцы і вывазцы лесу.

Зараз перад вёскай стаіць адна з адказнейшых задач — свечасова і добраякасна правесці веснавую сяўбу, дабіцца высокага ўраджаю і даць краіне і слаўнай Чырвонай Арміі больш хлеба, бульбы і другіх сельгаспрадуктаў.

Трэба адзначыць, што вясна нас не застала ў распалох. Сяляне заранеЙ рыхтаваліся да вясенне-палявых работ і сустрэлі пасяўную кампанію ў поўне падрыхтаванымі.

Яшчэ на прадвесні на агульным сходзе мы абмеркавалі ўсе пытанні, звязаныя з сяўбой, улічылі ўсе нашы магчымасці, размеркавалі цягавую сілу так, каб аказаць дзейсную дапамогу бясконным гаспадаркам і ў першую чаргу сем'ям франтавікоў і партызан.

Зараз на палях нашай вёскі ідзе напружаная праца. 110 гектараў ужо засеяна раннімі зернавымі культурамі, з іх 80 га аўса. Дзякуючы добра арганізаванай міжсуседскай дапамозе, паспяхова спраўляюцца з выкананнем даведзенага ім плана сяўбы, бясконныя гаспадаркі. Выдатныя прыклады міжсуседскай узаемадапамогі бясконным паказалі Слясарчык Канстанцыя, Мурашка Фёдар, Міхнюк Андрэй і другія.

На раду з сяўбой яравых-зернавых у нас ужо падрыхтавана глеба пад тэхнічныя культуры, праходзіць ворыва пад бульбу. Для атрымання высокага ўраджаю сяляне выкарыстоўваюць усе мясцовыя ўгнаенні, дапамагаюць у гэтай справе адзін другому.

Для больш дэталёвага ўліку пасеянага і ўзаранага прыцягнут увесь вясковы актыў. Добра дапамагаюць мне ў гэтай справе Дрозд Екацерына, Панасчык Люба, Мурашка Фёдар. У выніку нашай сумеснай работы, я маю магчымасць своечасова інфарміраваць Выканком сельсовета аб ходзе сяўбы ў нашай вёсцы.

У гэтым годзе сяляне нашай вёскі пасеюць больш чым сеялі раней. Па якасці апрацоўкі поля відаць, што ўраджай будзе добры. Няхай хутчэй дабіваюць нашы воіны фашысцкага звера, а хлеба і другіх прадуктаў мы ім дадзім у дастатковай колькасці.

**Ольга Радкевіч, упаўнаважаны Выканкома Стайкаўскага сельсовета.**

## Атрымаю высокі ўраджай

У гэту вясну я, як ніколі, адчуваю радасць жыцця, радасць працы. Перажыўшы чорныя дні нямецкай акупацыі, кожны з нас уздыхнуў вольнымі грудзьмі. Вось пагэтаму хочацца больш зрабіць на карысць радзімы, каб сваёй працай дапамагчы воінам Чырвонай Арміі хутчэй расправіцца з ворагам.

У нашай вёсцы сяўба зернавых падыходзіць да заканчэння. Падрыхтоўваецца глеба пад тэхнічныя і бульбу. Гэтага мы дабіліся дзякуючы дружнай міжсуседскай дапамозе бясконным гаспадаркам.

Але пасеяць — гэта яшчэ не ўсё. Я лічу асноўнай сваёй задачай — дабіцца з кожнага куска пасеянай зямлі высокага ўраджаю. Для гэтага я выкарыстаю ўсе мясцовыя ўгнаенні, арганізую за пасевамі добры догляд. Усе сілы прыкладу для атрымання высокага ўраджаю — гэта будзе маім падаркам слаўным воінам Чырвонай Арміі.

**Фёдар Мурашка, дэлегат 2-га абласнога схода сялян.**

## ДАВЕДЗЕНЫ МНЕ ПЛАН СЯЎБЫ — ВЫКАНАЮ

У мяне, як і ў некаторых другіх сялян нашай вёскі, няма свайго каня. А сеяць абавязкова трэба. Вось тут і прышлі мне на дапамогу суседзі. У нашай вёсцы на бясконных звернута асаблівая ўвага і кожны гаспадар, які мае каня лічыць сваім абавязкам аказаць дапамогу бясконнаму.

У сваю чаргу, я таксама стараюся аказаць дапамогу сем'ям воінаў Чырвонай Арміі. Сею, бараную, прывучаю да работы маладых коней.

Я магу з упэўненасцю заявіць, што пры той дапамозе, якую аказвае працоўнаму сялянству наша родная совецкая ўлада, пры актыўнай дапамозе друг другу, план сяўбы, даведзены да маёй гаспадаркі, з чэсцю выканаю і даб'юся высокага ўраджаю.

**Андрэй Мурашка.**

## МОЙ УКЛАД У СПРАВУ ПЕРАМОГІ НАД ВОРАГАМ

З дня вызвалення нашага раёна ад немцаў я ўсе сілы аддаваў, каб чым больш дапамагчы нашай вызваліцельніцы — роднай Чырвонай Арміі. Іначай і не можа быць. На сваёй уласнай скуры я выпрабаваў, што такое „новы парадак“ немцаў.

Адзін мой сын увесь час на фронце. Другі быў у партызанах. І жыў я пры немцах, чакаючы кожны дзень смерці. Немцы абрабавалі маю гаспадарку. Забралі каня, свіней, авечак, курэй. Не раз прыходзілася ўцякаць у лес. І гарыць у маёй душы гарачае пачуццё помсты да ненавісных ворагаў.

Асноўная мая задача зараз — чэсна, не пакладаючы рук, працаваць на полі, каб атрымаць больш прадуктаў для сябе, для радзімы, для нашай слаўнай Чырвонай Арміі. Гэта будзе мой большы ўклад у агульную справу перамогі над ворагам.

Нашы воіны могуць не сумнявацца, што мы сваёй напружанай працай тут, у тылу, на палях вызваленай зямлі не пасаромім іх вялікіх подвігаў у барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай радзімы.

**Міхнюк Андрэй.**

# НА ІВАЦЭВІЦКІМ СПІРТЗАВОДЗЕ Ў ЗАГОНЕ ПАЛІТЫКА-ВЫХАВАУЧАЯ РАБОТА

Івацэвіцкі спіртзавод—адно з буйнейшых прадпрыемстваў у нашым раёне. З попела і руін аднаўлен ён і зараз дае дарагую прадукцыю для радзімы, для фронта—спірт.

Можна многа гаварыць пра тое, як завод аднаўляўся, як залечваліся раны, нанесеныя яму нямецкімі варварамі пры адступленні, пра творчы энтузіязм рабочых і служачых, якія так многа паклалі працы пры аднаўленні завода. Усё гэта адзін з многіх фактаў працоўнага подвігу нашых савецкіх людзей, якія ва імя радзімы твораць цуды на працоўным фронце.

Прайшоў ужо вялікі адрэзак часу, як завод працуе на ўсю магутнасць. Аднак не адчуваецца тут таго бурнага вытворчага жыцця, якое было пры аднаўленні. Усё гэта тлумачыцца тым, што дырэкцыя завода, комуністы і комсамольцы выпусцілі з-пад увагі адзін з галоўнейшых фактараў сваёй работы—палітычнае выхаванне рабочых.

Дастаткова прывесці такі факт, што за ўвесь час свайго існавання комсамольская арганізацыя завода зрабіла толькі адзін сход, на якім выбралі комсорга. Вытворчымі пытаннямі комсамольская арганізацыя не займаецца.

На заводзе працуе каля 20-ці чалавек моладзі. Аднак з імі не вядзецца ніякай работы і моладзь прадастаўлена сама сабе. Комсорг т. Шабанава працуе адорвана не толькі ад моладзі, але і ад астальных комсамольцаў. Комсамольская арганізацыя не расце.

На заводзе працуюць два кандыдаты ў члены ВКП(б) т.т. Машанкова і Фіглярскі. Іх прамы абавязак аказаць дапамогу ў рабоце комсамольскай арганізацыі, арганізаваць паліт-масавую работу сярод рабочага калектыва. Але яны лічаць гэта лішнім. Яны нават да гэтага часу не ўзяліся на ўчот у РК КП(б)Б, не гледзячы на тое, што з дня іх прыходу на завод прайшло ўжо каля паўтара месяца.

Запушчанасць палітыка-выхаваўчай работы на заводзе яўна сказваецца на паводзінах некаторых рабочых. Наглядаюцца сістэматычная п'янка, прагулы і спазненні на работу. Так качагар Шурубейка часта прыходзіць на работу п'яным. А бывалі выпадкі, калі ён зусім не прыходзіў і другому качагару прыходзілася працаваць дзве змены падрад.

Дрэнна на заводзе пастаўлен і вытворчы бок справы. Востра адчуваецца недахоп рабочай сілы. Дырэктар спіртзавода т. Кіфарэнка не прымае рашучых мер па ўкамплектаванню завода неабходнымі кадрамі. Наадварот ён зняў адну вытворчую брыгаду і паставіў яе на пілку дроў, што стварыла вялікую нагрузку работы на астатніх рабочых вытворчасці.

Недастатковыя клопаты праяўляе дырэкцыя на матэрыяльныя і бытавыя ўмовы рабочых. Рабочыя не своечасова атрымліваюць хлеб і другія прадукты. На заводзе не наладжана грамадскае харчаванне. Не арганізавана стымуліраванне рабочых.

На заводзе маецца рад выдатных людзей—стаханаўцаў вытворчасці. Гэта апаратчык Фалітарчык, заторшчык Жэгайла, брадзільшчыца Смірнова, саладоўшчыцы Кротава і Яloўская. Усе яны выконваюць вытворчую праграму на 115—120 проц. Але іх вопыт не перадаецца другім рабочым. Вытворчыя нарады на заводзе—рэдкая заява.

Социялістычнае спаборніцтва не арганізована, не выпускаецца насценная газета.

Усе гэтыя факты гавораць за тое, што палітыка-выхаваўчая і культурна-асветная работа на Івацэвіцкім спіртзаводзе ў загоне. Яе трэба наладзіць неадкладна. Задача дырэкцыі, комуністаў і комсамольцаў завода несці словы большэвіцкай праўды ў рабочую масу, мабілізаваць яе на ящчэ большыя працоўныя подвігі ва імя нашай канчатковай перамогі над ворагам.

**А. Яравы.**

# БОЛЬШ СЕЯЦЬ—НАША КРОЎНАЯ ЗАДАЧА

Пры панскай Польшчы я меў 2 га. зямлі. Цяжка было жыць. А паны нас і за людзей не лічылі, быдлам называлі, праследвалі за малейшае падазрэнне.

1939 год адчыніў нам вочы. Мы ўбачылі, мы адчулі, якое раданае, якое шчаслівае жыццё, калі яно свабоднае. Але не доўга...

Налязела пражорлівая нямецкая саранча і апусташыла наш край. Морам крыві і слёз залілі нямецкія галаварэзы нашу старонку. Тысячы людзей загінулі ні за што.

Чырвоная Армія выгнала праклятых фашыстаў з нашай зямлі, назаўсёды вызваліўшы нас ад здзекаў і паднявольнай працы. Вось пагэтаму ў знак шчырай падзякі нашым воінам—вызваліцелям, мы павінны ўзорна правесці веснавую сяўбу і атрымаць высокі ўраджай.

Я сам стары чалавек, 2 сыны мае на фронце. Хіба змагу я сядзець склаўшы рукі ў той час, калі нашы воіны дабіваюць немца? І я працую. Вось ужо заканчыў сяўбу зернавых, узараў поле і дапамагаю сеяць бясконным Радкевіч Ользе, Панасчык Александры і Дрозд Каці.

У гэтым годзе я пасею больш, таму, што краіне і арміі трэба больш хлеба. Да гэтага павінен імкнуцца кожны селянін.

**Слесарчык Канстанцін,**
**селянін вёскі Размеркі**
**Стайкаўскага сельсовета.**

# Заканчваюць сяўбу ранніх зернавых культур

У социялістычным спаборніцтве паміж вёскамі на хутчэйшае заканчэнне веснавой сяўбы, першае месца ў Бусяжскім сельсовеце займае вёска Рацкевічы.

Упаўнаважаны Выканкома сельскага совета тав. Попка умела арганізаваў дапамогу бясконным гаспадарам, у выніку чаго ўсе сяляне вёскі заканчваюць сяўбу ранніх яравых культур. Аднačасова сяляне рыхтуюць глебу пад тэхнічныя культуры і бульбу.

**Ф. Баранаў.**

## Спаборніцтва трактарыстаў

Спаборнічаючы паміж сабой на хутчэйшае выкананне плана вясенне-палявых работ і за яшчэ лепшае аказанне дапамогі ў сяўбе бясконным гаспадаркам, трактарысты Івацэвіцкай МТС ужо абслужылі 60 бясконных гаспадарак, узараўшы каля 60 га. пасяўной плошчы.

Першае месца ў спаборніцтве займаюць трактарысты т-т. Трэцяк і Гладун. Працуючы на сваім трактары на палях вёскі Стайкі, яны ўжо ўзаралі 24 гектары і дабіліся эканоміі гаручага. Якасць ворыва добрая.

Добра працуюць таксама трактарысты Малаў і Ганчар на палях Альбінскага сельсовета. Яны ўзаралі 20 га і не дапускаюць перарасходу гаручага. Якасць іхняй работы таксама добрая.

Не наладзілі яшчэ па сапраўднаму сваю работу трактарысты т.т. Клютка і Дзікан. У іх часта бываюць прастоі трактара.

1-я мая трактарысты і механікі МТС сустрэнуць новымі поспехамі працы. Яны ўзялі на сябе абавязацельствы ліквідаваць малейшыя прастоі трактароў, дабіцца эканоміі гаручага, значна павялічыць вытворчасць працы на кожны трактар.

Паўлоўскі, дырэктар МТС.

## Упаўнаважаны сельсовета

Уключыўшыся ў соцыялістычнае спаборніцтва за хутчэйшае і добраякаснае правядзенне веснавой сяўбы, сяляне в. Хрышчонавічы Альшаніцкага сельсовета закончылі сяўбу ранніх яравых культур. Усяго пасеяна 45 га.

Упаўнаважаны Выканкома сельскага совета тав. Шумовіч правільна зразумеў сваю задачу ў правядзенні веснавой сяўбы. Дзякуючы ўмела арганізаванай міжсуседскай дапамогі, 34 бясконныя гаспадаркі таксама выканалі план сяўбы ранніх культур.

За добрасумленныя адносіны да сваіх абавязкаў тав. Шумовіч занесен на раённую Дошку Пачота.

Зараз у вёсцы ідзе напружаная падрыхтоўка да сяўбы тэхнічных культур. Многія сяляне пачалі садзіць бульбу.

Казімірчык.

## ДА ПЫТАННЯ АБ УДЗЕЛЕ ПОЛЬШЧЫ НА КАНФЕРЭНЦЫІ У САН-ФРАНЦЫСКА

У совецкім друку ўжо паведамлялася аб звароце Совецкага Ўрада да Ўрадаў Злучаных Штатаў Амерыкі, Вялікабрытаніі і Кітая па пытанню аб запрашэнні Польшчы на Канферэнцыю па запвярджэнню Міжнароднай Арганізацыі па падтрыманню міру і бяспекі, скліканую 25 красавіка ў г. Сан-Францыска. У гэтым звароце Совецкага Ўрада, як вядома, гаварылася, што калі ў бліжэйшым будучым не будзе ажыццёўлена або закончана Рэарганізацыя Часовага Польскага Ўрада, на канферэнцыю ў Сан-Францыска неабходна запрасіць прадстаўнікоў Польскага Ўрада ў Варшаве, які ажыццяўляе ўладу на ўсёй тэрыторыі Польшчы і карыстаецца падтрымкай польскага народа.

Па звестках, атрыманых з аўтарытэтных крыніц, Урады Злучаных Штатаў Амерыкі і Вялікабрытаніі ў сваіх адказах на ўказаны зварот Совецкага Ўрада паведамілі, што да ажыццяўлення рэарганізацыі Часовага Польскага Ўрада яны не лічэць магчымым запрасіць яго прадстаўнікоў на канферэнцыю ў Сан-Францыска. Кітайскі Ўрад у сваім адказе паведаміў Совецкаму Ўраду, што ім у дадзены час не прынята рашэнне па гэтаму пытанню. Кітайскі Ўрад матываваў гэта тым, што маючы на ўвазе адмоўны адказ Брытанскага і Амерыканскага Ўрадаў пытанне аб згодзе ці незгодзе Кітайскага Ўрада не мае, маўляў, практычнага значэння.

Па звестках, атрыманых з тых жа крыніц, Совецкі Ўрад прадаўжае настайваць на сваёй прапанове аб неабходнасці абавязковага ўдзелу ў канферэнцыі ў Сан-Францыска прадстаўнікоў Польшчы ў асобе Часовага Польскага Ўрада.

(ТАСС).

## Замежная хроніка

У Швейцарыю тайна прыбыў вядомы германскі тэрарыст і галоўная давераная асоба германскага архізагаворшчыка фон Папена маёр Вальдэмар Пабст.

* *
*

Парыжскі суд прыгаварыў да кары смерцю начальніка спецыяльнай брыгады па рэпрэсіях да французскіх патрыётаў у час германскай акупацыі—Давідэ, вінаватага ў катаваннях і забойстве 120 патрыётаў.

## Зводка

ходу сяўбы зерневых-яравых па раёну, на 21 красавіка ў процэнтах да плана сяўбы.

| Назва сельсоветаў | Процэнт выканання |
|---|---|
| 1. Яблонскі | 98,8 проц. |
| 2. Любішчыцкі | 92,9 проц. |
| 3. Стайкаўскі | 91,4 проц. |
| 4. Гошчаўскі | 77,8 проц. |
| 5. Альшаніцкі | 77,8 проц. |
| 6. Грыўдзенскі | 76,4 проц. |
| 7. Альбінскі | 59 проц. |
| 8. Белавіцкі | 57,1 проц. |
| 9. Падстарынькі | 54,7 ,, |
| 10. Івацэвіцкі | 53, 8 ,, |
| 11. Жытлінскі | 49,1 проц. |
| 12. Косаўскі горсовет | 43,9 проц. |
| 13. Бусяжскі | 43,8 проц. |
| 14. Сенькавіцкі | 39,5 проц. |
| 15. Яглевіцкі | 35,2 проц. |

Адказны рэдактар **А. П. Рудой**

Г Л 15257 Адрас рэдакцыі: Косаў, вул. Максіма Горкага 106